**Умовы правядзення**
**II Рэспубліканскага фестывалю-конкурсу**
**праектаў навучэнцаў “Нашчадкі традыцый”**

## I. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1.1 Дадзеныя ўмовы вызначаюць парадак арганізацыі і правядзення II Рэспубліканскага фестывалю-конкурсу праектаў навучэнцаў “Нашчадкі традыцый” (далей – конкурс).

1.2 Конкурс праводзіцца ў адпаведнасці з Канцэпцыяй і Праграмай бесперапыннага выхавання дзяцей і вучнёўскай моладзі, Дзяржаўнай праграмай “Адукацыя і маладзёжная палітыка” і прысвечаны Году народнага адзінства.

1.3 Арганізатарамі конкурсу з’яўляюцца Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, установа адукацыі “Нацыянальны цэнтр мастацкай творчасці дзяцей і моладзі” Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь (далей – Нацыянальны цэнтр мастацкай творчасці дзяцей і моладзі).

1.4 Конкурс праводзіцца з мэтай патрыятычнага і духоўнамаральнага выхавання навучэнцаў праз іх далучэнне да каштоўнасцей беларускай культурнай спадчыны, вывучэння рэгіянальных народных традыцый і развіцця дзіцячай творчасці ў галіне беларускага народнага мастацтва. Задачы: павышэнне матывацыі да даследчай дзейнасці і развіццё пазнавальнай актыўнасці навучэнцаў; падтрымка і развіццё творчай ініцыятывы па выкарыстанні і распаўсюджванні мастацкіх традыцый рэгіёна; развіццё практычных навыкаў і творчых здольнасцей навучэнцаў сродкамі беларускай народнай творчасці; выхаванне павагі да народнай культуры, пашырэнне ведаў, удасканаленне этнакультурных і даследчых кампетэнцый, майстэрства па выкананні і прэзентацыі мастацкіх твораў; садзейнічанне сацыялізацыі асобы ва ўмовах сучаснага грамадства з улікам выхаваўча-адукацыйнага патэнцыялу беларускай народнай спадчыны.

1.5 Конкурс праводзіцца з мая 2021 года па красавік 2022 года па наступных намінацыях:

- ***Народная дэкаратыўна-прыкладная творчасць: традыцыі і сучаснасць***
  Прадстаўляюцца праекты ў галіне народнай дэкаратыўна-прыкладной творчасці (мастацкі роспіс, мастацкі тэкстыль, кераміка, мастацкая апрацоўка саломкі, выцінанка і інш.), якія накіраваны на даследаванне, захаванне, мастацкую рэканструкцыю элементаў традыцыйнай культуры і творчае пераасэнсаванне беларускай народнай спадчыны ў сучасных умовах.
- ***Фальклорная творчасць: традыцыі і сучаснасць***
  Прадстаўляюцца праекты ў галіне фальклорнай творчасці (музычнай, харэаграфічнай, гульнёвай, абрадавай і інш.), якія накіраваны на даследаванне, захаванне, мастацкую рэканструкцыю элементаў традыцыйнай культуры і творчае пераасэнсаванне беларускай народнай спадчыны ў сучасных умовах.

- ***Народная творчасць: традыцыі і сучаснасць***

  Прадстаўляюцца інтэграваныя праекты ў галіне народнай творчасці (дэкаратыўна-прыкладной, фальклорнай, тэатральнай і інш.), якія накіраваны на даследаванне, захаванне, мастацкую рэканструкцыю элементаў традыцыйнай культуры і творчае пераасэнсаванне беларускай народнай спадчыны ў сучасных умовах.

II. УДЗЕЛЬНІКІ КОНКУРСУ

2.1 У конкурсе прымаюць удзел навучэнцы – аўтары індывідуальных, калектыўных праектаў – устаноў дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі і ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі, педагагічныя работнікі, якія ажыццяўляюць падтрымку праектнай дзейнасці і яе метадычнае суправаджэнне.

2.2 Узроставая катэгорыя ўдзельнікаў конкурсу – ад 10 да 18 гадоў.

III. ПАРАДАК АРГАНІЗАЦЫІ І ПРАВЯДЗЕННЯ КОНКУРСУ

3.1 Для падрыхтоўкі і правядзення конкурсу ствараюцца раённы, абласны (Мінскі гарадскі) і рэспубліканскі арганізацыйныя камітэты (далей – аргкамітэт) конкурсу, зацвярджае іх і ўзнагароджвае пераможцаў і прызёраў.

3.2 Рэспубліканскі конкурс праводзіцца ў **тры этапы** з вызначэннем пераможцаў і прызёраў другога і трэцяга этапаў:

***першы этап*** – май – лістапад 2021 года – ва ўстановах адукацыі, у тым ліку ва ўстановах адукацыі **раённага** падпарадкавання і ўключае распрацоўку і рэалізацыю праектаў. Для арганізацыі падрыхтоўчага этапу і адбору праектных работ навучэнцаў ствараецца раённы аргкамітэт. Да 1 снежня раённы аргкамітэт прадстаўляе ў абласны (Мінскі гарадскі) аргкамітэт праектныя работы навучэнцаў;

*другі этап* – снежань 2021 года – студзень 2022 года – абласны (Мінскі гарадскі). Для арганізацыі экспертызы і вызначэння пераможцаў і прызёраў абласнога (Мінскага гарадскога) этапаў конкурсу на базе абласных устаноў дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, Мінскага дзяржаўнага палаца дзяцей і моладзі ствараюцца адпаведныя аргкамітэты і экспертныя камісіі. На дадзеным этапе ў конкурсе прымаюць удзел установы адукацыі абласнога і Мінскага гарадскога падпарадкавання;

*трэці этап* – люты – красавік 2022 года – рэспубліканскі (заключны), які праводзіцца ў два туры:

*папярэдні тур* – люты – сакавік 2022 года – экспертыза і ацэнка праектных работ навучэнцаў;

*выніковы тур* – красавік 2022 года – падвядзенне вынікаў конкурсу, творчая прэзентацыя праектаў навучэнцаў, пераможцаў і прызёраў конкурсу, прадстаўленне прадуктаў праектнай дзейнасці (выстаўка мастацкіх вырабаў, творчыя выступленні фальклорных калектываў і інш.) адбудуцца на фестывалі праектаў у рамках III Рэспубліканскага педагагічнага форуму ў Нацыянальным цэнтры мастацкай творчасці дзяцей і моладзі.

На рэспубліканскім этапе ў конкурсе прымаюць удзел установы адукацыі рэспубліканскага падпарадкавання.

3.3 Для ўдзелу ў абласным этапе конкурсу ў абласны аргкамітэт **да 20 лістапада 2021 года** неабходна прадставіць:
*інфармацыйна-арганізацыйныя матэрыялы конкурсу* па электроннай пошце dtdmgrodno@yandex.by з паметкай (Нашчадкі традыцый – назва рэгіёна), выпіску з пратакола рашэння раённых аргкамітэтаў па выніках правядзення раённых этапаў конкурсу, зводную заяўку на ўдзел у конкурсе па прапанаванай форме, спасылку на Google Дыск з матэрыяламі конкурсу (ствараецца абласнымі аргкамітэтам);
*лепшыя праектныя работы навучэнцаў* – (тэкставыя распрацоўкі і відэаролікі з прэзентацыяй вопыту і дэманстрацыяй вынікаў праектнай дзейнасці) па выніках правядзення раённых этапаў дасылаюцца на адрас абласнога аргкамітэта (220023, г. Гродна, Каложскі парк, 1, УА "Гродзенскі дзяржаўны абласны Палац творчасці дзяцей і моладзі", сектар этнакультуры і мастацкай адукацыі тэл. 8 (015) 68086011, каб. 211) і размяшчаюцца на Google Дыску адпаведна конкурсных намінацый.
Пры адсутнасці вышэйпералічаных матэрыялаў конкурсныя работы да ўдзелу ў заключным этапе конкурсу не дапускаюцца.
3.4 Праектныя работы навучэнцаў прадстаўляюцца на беларускай мове. Афармленне і структура праектнай работы (тэкставай распрацоўкі) уключае наступныя часткі:
тытульны ліст (змяшчае: поўную назву ўстановы; тэму праекта; прозвішча, імя навучэнца(-цаў)-аўтара(-аў) праекта цалкам; узроставую катэгорыю; назву аб'яднання па інтарэсах; прозвішча, імя і імя па бацьку кіраўніка праекта цалкам; горад, год); змест (уключае назву ўсіх загалоўкаў з указаннем нумароў старонак, на якіх размяшчаюцца матэрыялы);
пашпарт праекта (уключае: назву праекта; тып праекта; адукацыйную вобласць; метады, выкарыстаныя ў праекце; формы прадстаўлення вынікаў праекта; установы і арганізацыі, ва ўзаемадзеянні з якімі выконваецца праект);
уводзіны (аб'ём да дзвюх старонак): матывуецца выбар тэмы, вызначаецца яе актуальнасць (тэарэтычнае і практычнае значэнне); мэты і задачы праекта; вылучаецца гіпотэза;
асноўная частка (не больш за 10–15 старонак): раскрываецца змест праблемы; аналізуюцца розныя пункты гледжання на праблему доследу, наяўныя ў літаратуры; выкарыстоўваецца даследчы матэрыял, даецца апісанне і аналіз шляхоў і метадаў вырашэння праблемы; апісанне мастацкага (творчага) прадукту праекта. Асноўная частка можа складацца з некалькіх падраздзелаў; яе змест павінен дакладна адпавядаць тэме работы і цалкам яе раскрываць; заключэнне (абагульняюцца вынікі праведзенай работы і іх аналіз, фармулююцца высновы праектнай дзейнасці);
спіс выкарыстанай літаратуры (змяшчае крыніцы інфармацыі: навукова-папулярныя часопісы і кнігі, падручнікі і навучальныя дапаможнікі, слоўнікі, энцыклапедыі, інтэрнэт-крыніцы і інш.); дадаткі могуць уключаць: фальклорна-этнаграфічныя матэрыялы, распрацоўкі сцэнарыяў, тэхналагічныя карты, фотаілюстрацыі, буклеты, дадатковыя табліцы, графікі,

малюнкі і іншыя матэрыялы, неабходныя для лепшага разумення атрыманых вынікаў.
Праект выконваецца ў адпаведнасці з наступнымі патрабаваннямі фарматавання: тэкст работы друкуецца з дзвюх старонак ліста ў фармаце А 4 з палямі: злева – 30 мм, справа – 10 мм, зверху і знізу – 20 мм у тэкставым рэдактары Word (не ніжэй Word 97), шрыфтам № 14 Times New Roman, міжрадковым інтэрвалам – 1.
Загалоўкі друкуюцца малымі літарамі (першая – вялікая). Старонкі неабходна нумараваць арабскімі лічбамі. Нумар старонкі прастаўляецца на ніжнім полі старонкі па цэнтры.
У табліцах варта выкарыстоўваць толькі адзін стыль межаў – суцэльную лінію (табліцы патрэбна афармляць карэктна па ўсіх правілах работы з табліцамі ў рэдактары MS Word). Усе наяўныя ў тэксце гіперспасылкі павінны быць рабочымі.
Спіс літаратуры і інтэрнэт-рэсурсаў варта размясціць у канцы дакумента. У тэксце спасылкі на літаратуру афармляюцца ў квадратных дужках.
3.5 У відэароліках аўтары прэзентуюць вопыт і дэманструюць прадукты праектнай дзейнасці: мастацкія вырабы народнай дэкаратыўнапрыкладной творчасці, творы музычнага (песеннага, інструментальнага), харэаграфічнага фальклору, мастацкую рэканструкцыю святочна-абрадавых комплексаў, фальклорна-тэатральных прадстаўленняў і інш. з выкарыстаннем адпаведных элементаў і сінтэз розных відаў народнага мастацтва. Аўтары выкарыстоўваюць непасрэдны каменціраваны паказ у дэманстрацыі вынікаў і прадуктаў творчай праектнай дзейнасці, рашэнні практычных і даследчых задач.
Працягласць відэароліка – да 10 хвілін, тэхнічныя параметры: HD 1280x720; 1920x1080; фармат відэафайла – mp 4, AVI.

## IV. ПАДВЯДЗЕННЕ ВЫНІКАЎ КОНКУРСУ

4.1 Экспертызу прадстаўленых матэрыялаў у адпаведнасці з патрабаваннямі конкурсу праводзіць экспертная камісія, якая фарміруецца са спецыялістаў адпаведнага напрамку дзейнасці і прадстаўнікоў зацікаўленых арганізацый па запрашэнні аргкамітэта.
4.2 Экспертыза праектных работ навучэнцаў праводзіцца па наступных крытэрыях:
фармулёўка тэмы і аргументацыя канцэпцыі праекта;
актуальнасць і значнасць; лагічнасць, паўната раскрыцця тэмы;
самастойнасць даследавання;
наяўнасць абгрунтаваных высноў;
адпаведнасць рэгіянальным мастацкім традыцыям;
творчае пераасэнсаванне народнай спадчыны;
мастацкая выразнасць і якасць выканання (для творчых прадуктаў праектнай дзейнасці);
стыль, мова выкладання матэрыялу (яснасць, вобразнасць, лаканічнасць, лексіка, граматыка);

культура афармлення матэрыялаў;
адпаведнасць умовам конкурсу.

4.3 Экспертная камісія вызначае пераможцаў і прызёраў з ліку ўдзельнікаў конкурсу ў кожнай намінацыі. Па рашэнні экспертнай камісіі колькасць прызавых месцаў можа быць зменена і вызначаецца з улікам высокай ацэнкі праектаў па адпаведных крытэрыях.

Зводная заяўка

______________________________________________

(назва абласной установы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі) на ўдзел у заключным этапе II Рэспубліканскага фестывалю-конкурсу праектаў навучэнцаў “Нашчадкі традыцый”

| № п/п | Назва праекта | Намінацыя | Навучэнцы, удзельнікі калектыўнага (індывід.) праекта. Прозвішча і імя цалкам | Узроставая катэгорыя | Аб’яднанне па інтарэсах | Прозвішча, імя, імя па бацьку педагога, кіраўніка праекта цалкам | Назва і адрас установы адукацыі | Адрас электроннай пошты і нумар тэлефона для сувязі |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | |

*У дыпломах выкарыстоўваюцца дадзеныя згодна зводных заявак, якія прадстаўлены раённымі аргкамітэтамі.